Хотя терминологические единицы заимствуются достаточно активно, нельзя сказать, что во вьетнамском и русском языках произошёл полный процесс формирования компьютерной терминосистемы. Хотя ранее в докладе было сказано, что четверть слов из составленного нами вьетнамского словаря составляют англицизмы, тем не менее в выборке собственно лексических заимствований — только 12 %, или 27 слов. Оставшиеся 32 слова имеют аналоги-дублеты вьетнамского происхождения, их как раз 13 %. Например, наряду с английским заимствованием *spam* во вьетнамском языке функционирует и термин *thư rác*, или ‘мусорное письмо’, наряду с *display* (‘монитор, дисплей’) существует вьетнамское *màn hình*, или ‘экран изображения’. В русском языке примеры: *браузер* и *веб-обозреватель*, *винчестер* и *жёсткий диск*, *геймер* и *игрок*, *емэйл* и *электронная почта*, *парсинг* и *синтаксический анализ*, *профайл* и *личная страничка* и др. Как видим, заимствования в русском языке часто более краткие, к ним склоняются в своей профессиональной речи пользователи, потому что они позволяют экономить время и упрощают профессиональное общение.

**Заключение.** Насыщение англоязычными заимствованиями вьетнамской и русской компьютерной лексики — это живой процесс, динамичный и неустоявшийся. Во вьетнамском языке наблюдается своеобразная борьба между различными вариантами передачи одного и того же содержания. Вьетнамский язык в большей степени стремится сохранить национальную самобытность, но в то же время оба языка (и русский, и вьетнамский) открыты инновациям со стороны компьютерной лексики.

**Список цитируемых источников**

1. *Мусийчук, В. А.* Новые фонетические заимствования во вьетнамском языке: темпоральный и социолингвистический аспект / В. А. Мусийчук // Вьетнам. исслед. — 2014. — С. 286—296.
2. *Вирус* [Электронный ресурс] // Википедия (на вьетнамском языке). — Режим доступа: https://vi.wikipedia.org/wiki/Virus . — Дата доступа: 30.03.2020.
3. *Балли, Ш.* Французская стилистика / Ш. Балли. — М. : Изд-во иностр. лит., 1961. — 394 с.

УДК 821.161.3:82-1Марозаў

**А. У. Шлег**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

## АКТУАЛЬНЫЯ ЭКАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ Ў ПАЭЗІІ ЗМІТРАКА МАРОЗАВА

**Уводзіны.** У 1970—80-х гадах літаратары актыўна звяртаюцца менавіта да экалагічнай праблематыкі. Пісьменнікі сцвярджаюць, што адным з фактараў, які фарміраваў светаадчуванне беларуса, была векавечная сувязь чалавека з навакольным асяроддзем, які не ўяўляў сябе па-за прыродай.

**Асноўная частка.** Як адзначае Жардзецкая, «пісьменнікі, апярэдзіўшы навукоўцаў, пачалі казаць пра спецыфічна беларускія праблемы, звязаныя з умяшальніцтвам чалавека ў працэсы прыроды: асушэнне Палесся (меліярацыя балот), забруджванне наваколля хімічнымі рэчывамі і радыяцыяй. Напрыклад, публіцыстыка А. Адамовіча, В. Казько “Цвіце на Палессі груша” (1978), “Неруш” (1981), “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел” (1991) і інш. Потым адбываецца тэхнагенная чарнобыльская катастрофа, і экалагічная тэма выходзіць на новы віток» [1, с. 17].

Тэма ўзаемаадносін чалавека і прыроды ў літаратуры нашых дзён гучыць па-грамадзянску абвострана, з драматычнай напружанасцю або рамантычнай прыўзнятасцю, раскрываецца яна ў перапляценні з найважнейшымі сацыяльнымі і маральна-этычнымі праблемамі эпохі [2, с. 23].

В. Старычонак лічыць, што «на фарміраванне карціны свету, у тым ліку і экалагічнай, вялікі ўплыў аказвае асяроддзе, у якім выхоўваецца чалавек. Парог адчувальнасці ў чалавека творчага вышэйшы, чым у астатніх. Убачанае мастак “прапускае праз сябе”, што потым знаходзіць адбітак у яго творчасці. Возьмем, напрыклад, такі фактар, як месца, дзе рос і гадаваўся пісьменнік. Таму, як правіла, у творчасці такіх людзей прырода паўстае як фон, на якім разгортваюцца падзеі. Аднак відавочна, што большая частка паэтаў і празаікаў — гэта выхадцы з вёскі, хутара. Таму зразумела: у іх тэкстах прырода з’яўляецца адным з самых важных персанажаў, без якога, уласна кажучы, не было б і твора» [5, с. 111].

Як слушна заўважае М. Мажэйка, «ідэалагічная праграма пабудовы сацыялістычнага грамадства, як грамадства новага тылу, дапускала, як вядома, і “вялікае пераўтварэнне прыроды”. “Будоўлі стагоддзя”, “гіганты індустрыі”, якія не праходзілі элементарнай экалагічнай экспертызы, бяздумная меліярацыя і грандыёзныя інжынерныя праекты тылу “павароту паўночных рэк” — усё гэта сумна вядомыя крокі сацыялістычнага варыянту індустрыялізацыі» [3, с. 26].

У творах Змітрака Марозава можна заўважыць дзве тэндэнцыі асэнсавання экалагічнай праблемы: 1) паказ гарманічнага суіснавання чалавека і прыроды; 2) паказ страты гэтай гармоніі, паглыбленне экалагічнага крызісу.

© Шлег А. У., 2020

Рэпазіторый БарГУ

Гармонія чалавека і прыроды, а таксама паяднанне іх у агульным біярытме Марозаў нам паказвае ў творы «Луг начны пад росным сейвам стыне…». Цвыркуна аўтар параўноўвае з італьянскім скрыпачом Нікола Паганіні. Сама асоба Паганіні, ахутаная арэолам містыкі і таямнічасці, непазбежна прывяла да ўзнікнення самых разнастайных чутак. Сярод іх была і ўпэўненасць у тым, што ён прадаў душу д'яблу, каб здабыць свой талент. Менавіта гэтая акалічнасць і падштурхнула Марозава параўнаць цвыркуна з італьянскім скрыпачом. Лірычнага героя настолькі ўразілі гэтыя гукі, што ён раптам пачынае плакаць, як дзіця: *«Гаснуць зоркі ў зябкай вышыні // І цвыркун — мясцовы Паганіні — // Скрыпачку спрабуе ў цішыні. // Ён кранае струны дабрыні, // Счараваны той маленькай лірай, // Я заплакаў раптам, як дзіця»* [4, с. 118].

Паглыбленне экалагічнага бедства выяўляецца ў вершы «Знак таямнічай катастрофы». У творы прысутнічае адчуванне глабальнага крызісу. Начное неба заўсёды рабіла вялікае ўражанне на людзей. У мінулыя часы нашы продкі лічылі, што па зорках можна прадказаць лёс чалавека. У першым радку «зорныя нябёсы» выступаюць як прадвесце року на лёс чалавецтва: *«Якія зорныя нябёсы! — // Да шчасця гэта ці бяды»*. Вобраз жаўранка заўсёды асацыюецца са шчасцем, раніцай, вясной. Але аўтар нам гаворыць, што «цывілізацыі сляды» закрануць кожную жывую істоту. Змітрок Марозаў параўноўвае жаўранка з Іісусам Хрыстом, паказваючы, што птушка выступае ахвярай чалавечай абыякавасці: *«Знак таямнічай катастрофы — // Распяты трупік жаўрука»* [4, с. 75—76].

У вершы «Гарыць тарфяннік за пасёлкам…» Змітрок Марозаў дэманструе духоўную дэградацыю чалавецтва праз абыякавасць да прыроды, адлюстроўвае нават і сучасныя рэаліі грамадства праз гэту абыякавасць. Вобраз агню ў літаратуры выступае як ачышчэнне, так і як знішчэнне. Аўтар паказвае людзей, якія не думаюць аб наступствах сваіх дзеянняў, а таксама вялікую знішчальную моц цыгарэты, якая стала прычынай пажару.

Матыў вяртання да духоўных арыенціраў, як да шляху разумнага жыцця ў свеце, Марозаў раскрывае ў вершы «Пусці мяне ў свой свет, прырода…». Лірычны герой прызнае тое, што чалавек і прырода існуюць у непарыўнай сувязі, спрабуе загладзіць віну людзей і прызнае непасрэдную чалавечую залежнасць ад прыроды: *«Судзі за рэкі і крыніцы, // За дрэвы, згубленныя мной… // Прырода, я прыйшоў скарыцца, // Бо я не цар, а служка твой»* [4, с. 131].

У вершы «У глушы першароднага бору…» гучыць матыў захавання прыродных багаццяў. Аўтар закранае праблему знішчэння лясоў. Паводле народных вераванняў у пень перамяшчаецца драўляны дух, які пакінуў ссечанае дрэва. Само дзеянне «прысесці на пні», згодна з міфалагічнымі ўяўленнямі, тоіць у сабе пагрозу для жыцця. Таму лірычны герой гаворыць дрэвам, што ён прыйшоў з дабратой і спадзяецца не наклікаць на сябе бяды: *«І прысеў, нібы старац, на пні // І падумаў: ну што можа значыць // Мой прыход нечаканы сюды? // Я прыйшоў з дабратой — дрэвы бачаць, — // Хай яна не нakліча бяды!»* [4, с. 134].

**Заключэнне.** Змітрок Марозаў звяртаецца да экалагічнай тэматыкі, каб паказаць спецыфічныя беларускія праблемы, звязаныя з умяшальніцтвам чалавека ў працэсы прыроды. Захаванне прыроднага асяроддзя — найвастрэйшае сацыяльнае пытанне, якое ўздымае аўтар у сваіх творах. Але, нягледзячы на гэта, З. Марозаў таксама паказвае гармонію чалавека і прыроды.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Жердецкая, А. В.* Проблема взаимоотношений человека и природы — глобальная проблема века / А. В. Жердецкая // Канцэптуальныя пытанні развіцця літаратуры і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа. — Мазыр, 1998. — С. 23—27.
2. *Законнікаў, С.* Беларускае сэрца: публіцыстычны роздум, эсэ / С. Законнікаў. — Мінск : Беларусь, 1993. — 85 с.
3. *Мажэйка, М.* Дэфармацыя экалагічнай свядомасці / М. Мажэйка // Род. прырода. — 1996. — № 6. — С. 26—27.
4. *Марозаў, З.* Хлебны верасень: вершы, паэмы : для ст. шк. узросту / З. Марозаў. — Мінск : Юнацтва, 1988. — 143 с.
5. *Старычонак, В. Дз.* Ах, сачыненні, сачыненні… : у дапамогу абітурыентам / В. Дз. Старычонак. — 3-е выд., стэр. — Мінск : Выш. шк., 1996. — 220 с.

УДК [001.4+004]:811.161.3

**Я. Д. Ягаўдзік**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», Мінск, Рэспубліка Беларусь*

## ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ТЭРМІНАЛОГІІ Ў ГАЛІНЕ ПРАГРАМАВАННЯ

**Уводзіны.** Сучаснае грамадства немагчыма ўявіць без інфармацыйных тэхналогій, якія зараз выкарыстоўваюцца ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці. Гэта не магло не адбіцца на мове. Развіццё інфарматыкі, інфармацыйных тэхналогій выклікала з'яўленне новых спецыяльных слоў, якія звязаны з гэтай сферай. Наша праца прысвечана разгляду спецыяльнай лексікі ў галіне праграмавання.

© Ягаўдзік Я. Д., 2020

Рэпазіторый БарДУ